УДК 9:378.662(476)

**А. К. Дубовік**
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

# БЕЛАРУСКІ ХІМІКА-ТЭХНАЛАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ: СТВАРЭННЕ І ДЗЕЙНАСЦЬ (1930–1933 ГГ.)

Разглядаецца станаўленне вышэйшай хіміка-тэхналагічнай адукацыі ў Савецкай Беларусі ў 1930–1933 гг. У студзені 1930 г. урад БССР вырашыў перавесці адкрыты ў 1929 г. хіміка-тэхналагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў ствараемы ў Мінску політэхнічны інстытут. Аднак у сувязі з новым курсам у СССР на адкрыццё невялікіх вышэйшых тэхнічных навучальных устаноў (ВТНУ) у ліпені 1930 г. быў арганізаваны самастойны Беларускі хіміка-тэхналагічны інстытут (БХТІ) у Мінску. Дырэктарам прызначаны Я. З. Куніца. Паказаны праблемы станаўлення ВТНУ: дэфіцыт прафесарска-выкладчыцкіх кадраў, востры недахоп аўдыторый, месцаў у інтэрнатах для студэнтаў. У чэрвені 1932 г. са складу БХТІ быў выдзелены Інстытут харчовай прамысловасці, але праз дзевяць месяцаў прынята рашэнне аб аб'яднанні іх зноў у адзіны інстытут. Паколькі «карлікавыя» ВТНУ сябе не апраўдалі, у ліпені 1933 г. БХТІ ўвайшоў як факультэт у склад адчыненага нарэшце Беларускага політэхнічнага інстытута, дзе ў 1934 г. адбыўся першы выпуск спецыялістаў – былых студэнтаў БХТІ. У артыкуле прыведзены звесткі пра вядучых навукоўцаў, выкладчыкаў БХТІ, а таксама студэнтаў ВТНУ, якія сталі потым вядомымі вучонымі і кіраўнікамі.

**Ключавыя словы:** вышэйшая тэхнічная адукацыя, вышэйшыя тэхнічныя навучальныя ўстановы, хіміка-тэхналагічная адукацыя, Беларускі хіміка-тэхналагічны інстытут, Беларускі політэхнічны інстытут.

**Для цытавання:** Дубовік А. К. Беларускі хіміка-тэхналагічны інстытут: стварэнне і дзейнасць (1930–1933 гг.) // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2025. № 2 (299). С. 43–48.
DOI: 10.52065/2520-6885-2025-299-8.

**A. K. Dubovik**
Belarusian National Technical University

# BELARUSIAN INSTITUTE OF CHEMICAL TECHNOLOGY: CREATION AND ACTIVITIES (1930–1933)

The formation of higher chemical and technological education in Soviet Belarus in 1930–1933 is considered in the article. In January 1930 the Government of the BSSR decided to transfer the chemical engineering faculty of the Belarusian State University into the newly created Polytechnical Institute. However in connection with the new course in the USSR towads opening small technical colleges a separate Belarusian Institute of Chemical Technology (BICT) was created in July 1930. Ya. Kunitsa was appointed its director. The problems of formation of the Institute are shown: deficit of teachers, acute shortage of classrooms and places in dormitories for students. In June of 1932 the Institute of Food Industry was separated from the BICT but after nine months a decision was made to unite them again into one institute. Since dwarf higher technical educational institutions did not establish themselves, in July 1933 the BICT became faculty of the finally opened Polytechnical Institute. The article provides information about leading scientists and teachers of the BICT as well as about students who later became famous scientists and leaders.

**Keywords**: higher technical education, reorganization of higher education, higher technical educational institutions, chemical engineering education, Belarusian Institute of Chemical Technology, Belarusian Polytechnical Institute.

**For citation**: Dubovik A. K. Belarusian Institute of Chemical Technology: creation and activities (1930–1933). *Proceedings of BSTU, issue 6, History, Philosophy*, 2025, no. 2 (299), pp. 43–48 (In Belarusian).
DOI: 10.52065/2520-6885-2025-299-8.

**Уводзіны.** Гісторыю хіміка-тэхналагічнай адукацыі ў Беларусі нельга зводзіць толькі да дзейнасці Беларускага тэхналагічнага інстытута (з лістапада 1993 г. – Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт). Створаны ён быў у 1930 г. пастановай Савета Народных Камісараў (СНК) і Эканамічнай нарады БССР як Лясны інстытут у Гомелі, у 1932 г. перайменаваны ў Беларускі

лесатэхнічны інстытут, у 1946 г. пераведзены ў Мінск. Да 1961 г. дадзеная ВНУ рыхтавала кадры галоўным чынам для лясной гаспадаркі і лясной прамысловасці краіны. Загадам Міністра вышэйшай адукацыі СССР № 189 ад 15 чэрвеня 1961 г. інстытут быў рэарганізаваны з лесатэхнічнага ў Беларускі тэхналагічны інстытут імя С. М. Кірава [1]. У гэтай сувязі патрэбна разгледзець гісторыю стварэння і дзейнасці ў 1930–1933 гг. у Мінску Беларускага хіміка-тэхналагічнага інстытута, які рыхтаваў кадры для папяровай, шкляной, керамічнай і харчовай прамысловасці. Пакуль дадзеная тэма не з'яўлялася прадметам спецыяльнага даследавання ў навуковай літаратуры.

**Асноўная частка.** У сувязі з рэарганізацыяй у ліпені 1922 г. Беларускага дзяржаўнага політэхнічнага інстытута ў Інстытут сельскай і лясной гаспадаркі ў БССР не было вышэйшых тэхнічных навучальных устаноў. Па дадзеных ВСНГ БССР, на 1 кастрычніка 1927 г. у прамысловасці рэспублікі налічваліся толькі 474 спецыялісты, што ў адносінах да колькасці занятых рабочых складала 1,9%, прычым вышэйшую адукацыю мелі 82 спецыялісты, сярэднюю – 111, астатнія – 281 чалавек (59,3%) былі практыкамі [2, с. 51]. Патрэбны былі навучальныя ўстановы для падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі для прамысловасці.

У 1929 г. у Беларускім дзяржаўным універсітэце (БДУ) быў адкрыты хіміка-тэхналагічны факультэт, які рыхтаваў кадры тэхнолагаў для хімічнай, сілікатнай і харчовай прамысловасці. На першы курс быў залічаны 101 студэнт [3, арк. 16]. 14 снежня 1929 г. СНК БССР прыняў рашэнне арганізаваць вышэйшую тэхнічную навучальную ўстанову (ВТНУ) – Політэхнічны інстытут у Мінску, а 12 студзеня 1930 г. устанавіў яго структуру: хіміка-тэхналагічны факультэт, які пераводзіўся з БДУ, і яшчэ тры факультэты [4, арк. 11, 33]. Пачалася праца па стварэнні Політэхнічнага інстытута. Аднак, у сувязі з узятым у СССР курсам на стварэнне невялікіх ВНУ з вузкай спецыялізацыяй і трох-чатырохгадовым тэрмінам навучання, 17 ліпеня 1930 г. СНК БССР пастанавіў адкрыць не адзін буйны Політэхнічны інстытут, а хіміка-тэхналагічны, электратэхнічны і будаўнічы інстытуты ў Мінску і механічны ў Гомелі [5].

Дырэктарам Беларускага хіміка-тэхналагічнага інстытута (БХТІ) быў прызначаны Якаў Залманавіч Куніца, які дагэтуль займаўся падрыхтоўкай арганізацыі Політэхнічнага інстытута ў Мінску [6, арк. 114]. БХТІ размяшчаўся ва ўніверсітэцкім гарадку БДУ, складаўся з 4 аддзяленняў: папяровага, шклянога, керамічнага і харчовага. У апошнім былі брадзільны, крухмальна-патачны і кандытарскі цыклы. ВТНУ знаходзілася ў падпарадкаванні ВСНГ БССР [7, арк. 64]. У лютым 1931 г. быў адкрыты рабфак БХТІ, дзе на трох курсах займаўся 151 навучэнец, працавалі 14 выкладчыкаў, з іх 13 па сумяшчальніцтве [8, арк. 124]. Пазней аддзяленні рабфака БХТІ былі арганізаваны таксама ў Барысаве і Добрушы. З верасня 1931 г. дырэктарам БХТІ быў прызначаны Іван Іосіфавіч Дружалоўскі. У кастрычніку 1932 г. у сувязі з накіраваннем яго на вучобу ў Прамысловую акадэмію ў Харкаве дырэктарам БХТІ стаў начальнік сектара кадраў Наркамата лёгкай прамысловасці БССР Бедынэрман Р. Ю. [8, арк. 434].

У БХТІ працаваў шэраг вядомых навукоўцаў. Так, Мікалай Аляксандравіч Прыляжаеў (1877–1944) у 1900 г. скончыў Варшаўскі ўніверсітэт. У 1912 г. удастоены прэміі імя А. М. Бутлерава Рускага фізіка-хімічнага таварыства. З 1924 г. працаваў у БДУ, а з 1930 г. і ў БХТІ прафесарам кафедры арганічнай хіміі. Адначасова ў 1931–1933 гг. з'яўляўся дырэктарам Інстытута хіміі Беларускай акадэміі навук. З 1933 г. – член-карэспандэнт АН СССР, з 1940 г. – акадэмік Беларускай АН [9, с. 190–196].

Загадчыкам кафедры неарганічнай і аналітычнай хіміі БХТІ з'яўляўся дацэнт Гімельфарб С. М. (1894–1937), які да гэтага часу працаваў у БДУ, а таксама кіраваў кафедрай у Камуністычным універсітэце Беларусі (вышэйшай партыйнай навучальнай установе). Дацэнт Кугель Р. А., выпускнік Пецярбургскага горнага інстытута, з 1923 г. працаваў выкладчыкам хіміі ў БДУ, а з 1930 г. дацэнтам у БХТІ і Камуністычным універсітэце [10, арк. 18–22]. Кафедру матэматыкі ўзначальваў прафесар Уладзімір Кандратавіч Дыдырка (1877–1938), які адначасова працаваў прафесарам у БДУ [11, арк. 225; 12, с. 23–37].

Усяго ў лістападзе 1932 г. у БХТІ налічвалася 47 навуковых супрацоўнікаў: 7 прафесараў, 19 дацэнтаў, 11 асістэнтаў, 1 выкладчык, 5 аспірантаў, 4 лабаранты. Сярод іх – 17 беларусаў, 23 яўрэі, 7 рускіх. З 47 чалавек жанчын было 6. Абсалютная большасць (41 чалавек) былі беспартыйнымі. Кіраўніцкі персанал уключаў 6 чалавек [11, арк. 217, 223].

Асігнаванні на працу БХТІ ў 1932 г. склалі 520,1 тыс. руб., у тым ліку: на заработную плату – 160,8 тыс., на стыпендыі студэнтам – 181 тыс., абсталяванне – 115 тыс., бягучыя выдаткі на навучанне – 43 тыс., адміністрацыйна-гаспадарчыя выдаткі – 10,3 тыс. руб. і г. д. [11, арк. 229].

Разам з тым стварэнне ў краіне вялікай колькасці ВТНУ прывяло да з'яўлення інстытутаў са слабай матэрыяльнай базай. БХТІ першапачаткова размяшчаўся ўсяго ў трох аўдыторыях, у якіх трэба было арганізаваць навучанне 16 груп [7, арк. 70]. Пры гэтым распаўсюджанай з'явай было празмернае драбленне спецыяльнасцей [13, арк. 416]. Падобная сітуацыя назіралася і ў іншых створаных «карлікавых» інстытутах.

У БХТІ на 1 кастрычніка 1931 г. навучалася 267 студэнтаў: 179 мужчын і 88 жанчын; 139 беларусаў, 109 яўрэяў, 10 рускіх, 9 чалавек іншых нацыянальнасцей. 188 студэнтаў мелі рабочае паходжанне, 33 – сялянскае, 46 – служачыя. Па адукацыі: закончылі рабфак – 63, курсы ВНУ – 88, школы 2-й ступені – 42, тэхнікумы – 11, іншыя формы – 63 навучэнцы. Сярод студэнтаў было шмат камуністаў (39,7%) і камсамольцаў (27,3%), 43 парттысячнікі, накіраваныя на вучобу партыйнымі органамі. Заняткі вяліся ў дзве змены. Большасць студэнтаў былі забяспечаны інтэрнатам. У інстытуце працавалі сталовая і бібліятэка з фондам 20 тыс. кніг [11, арк. 210, 217].

У сувязі з рэарганізацыяй ВСНГ БССР у сакавіку 1932 г. БХТІ быў перападпарадкаваны Наркамату лёгкай прамысловасці [9, арк. 387]. 3 красавіка 1932 г. была прынята пастанова калегіі гэтага наркамата «Аб хіміка-тэхналагічным інстытуце», у якой гаварылася аб неабходнасці перадаць папяровае аддзяленне БХТІ Наркамату лясной прамысловасці па прычыне пераходу ў падпарадкаванне апошняга папяровай прамысловасці; паставіць пытанне перад Упаўнаважаным Наркамата цяжкай прамысловасці пры СНК БССР аб арганізацыі на базе керамічнага аддзялення БХТІ самастойнага інстытута будаўнічых матэрыялаў. Было даручана сектару кадраў Наркамлегпрама прапрацаваць пытанне аб спецыялізацыі БХТІ на абслугоўванне лёгкай прамысловасці [8, арк. 386]. Аднак нарада пры аддзеле кадраў ЦК КП(б)Б, якая заслухала даклады дырэктара БХТІ Дружалоўскага І. І. і супрацоўніка Наркамлегпрама Анодзіна І. І., пасля абмеркавання палічыла немэтазгодным праводзіць рэарганізацыю БХТІ ў 1932 г. Было адзначана, што выпуск спецыялістаў для папяровай прамысловасці павінен ажыццяўляць БХТІ на аснове прынятых навучальных планаў і праграм, але гэта не выключае магчымасці камандзіроўкі груп студэнтаў дадзенай спецыяльнасці ў іншую ВТНУ краіны для праходжання часткі дысцыплін. Прапанавана наркаматам цяжкай і лясной прамысловасці заключыць дагаворы з Наркаматам лёгкай прамысловасці аб падрыхтоўцы ў БХТІ спецыялістаў для іх галін; сектару кадраў Наркамата цяжкай прамысловасці і Дзяржплану БССР распрацаваць план запатрабаванасці ў спецыялістах-кераміках [8, арк. 385].

У чэрвені 1932 г. са складу БХТІ быў выдзелены Інстытут харчовай прамысловасці (дырэктар Школьнікаў З. Н.), які знаходзіўся ў падпарадкаванні рэспубліканскага Наркамата забеспячэння, аднак не меў навучальных плошчаў, абсталявання, інтэрната і г. д. Таму 8 верасня 1932 г. Сакратарыят ЦК КП(б)Б прыняў спецыяльную пастанову «Аб становішчы хіміка-тэхналагічнага інстытута харчовай прамысловасці», у якой, улічваючы яго цяжкі стан, абавязаў дырэкцыю БХТІ даць новай ВТНУ права карыстання аўдыторыямі і абсталяваннем, памяшканнем для адміністрацыйна-гаспадарчага персаналу, інтэрнатам. Для камплектавання новай ВТНУ перадаць ёй 50% выпускнікоў рабфака БХТІ на працягу двух гадоў [8, арк. 1–2; 14, арк. 200–201].

Набор 1932 г. склаў у БХТІ 450 студэнтаў і 125 рабфакаўцаў на дзённую форму і па 50 чалавек без адрыву ад працы. Было сфарміравана 56 навучальных груп, аднак не хапала 13 аўдыторый і 350 месцаў у інтэрнатах (з улікам толькі студэнтаў-стыпендыятаў). Каб вырашыць праблему, было пачата будаўніцтва новага навучальнага корпуса. У Інстытуце харчовай прамысловасці ў чэрвені 1932 г. налічвалася 78 студэнтаў (45 мужчын і 33 жанчыны), якія былі пераведзены з БХТІ. Асенні набор склаў 100 студэнтаў дзённай формы і 60 завочнай. Было сфарміравана 7 навучальных груп, але не хапала 10 аўдыторый і 140 месцаў у інтэрнатах [15, арк. 5].

IV пленум ЦК КП(б)Б, які адбыўся ў пачатку снежня 1932 г., разгледзеў пытанне «Рашэнні ЦК Усесаюзнай КП(б) аб масавай і вышэйшай школе», заслухаў даклады наркамаў, у веданні якіх знаходзіліся ВНУ. Наркам лёгкай прамысловасці Грысевіч Р. П. адзначыў дэфіцыт прафесарска-выкладчыцкіх кадраў. У БХТІ не хапала 4 прафесараў і 4 дацэнтаў. Тыя ж, хто выкладаў у інстытуце, адначасова працавалі ў іншых ВНУ, што адбівалася на якасці падрыхтоўкі выкладчыкаў да лекцый. У БХТІ «вымушаны былі пайсці нават на такі кабальны дагавор, каб плаціць прафесару 25 рублёў за гадзіну (праўда, сюды ўключаецца і кватэра, і мяккі вагон, у якім ён едзе). На гэта пайшлі ў хіміка-тэхналагічным інстытуце, каб запрасіць спецыялістаў, не сарваць падрыхтоўку кадраў для шкляной прамысловасці» [13, арк. 421]. БХТІ рыхтаваў кадры таксама для цэментнай і папяровай галін прамысловасці.

Тым часам палітыка ў галіне арганізацыі і структуры вышэйшай тэхнічнай адукацыі ў краіне пачала мяняцца. Для выканання пастаноў ЦВК СССР (верасень 1932 г.) і снежаньскага (1932 г.) пленума ЦК КП(б)Б аб вышэйшай школе было прынята рашэнне аб узбуйненні шэрагу ВНУ, у тым ліку стварэнні на базе БХТІ і Інстытута харчовай прамысловасці аднаго інстытута, дзе тэрмін навучання ўстаноўлены ў 5 гадоў [8, арк. 407–408]. 3 сакавіка 1933 г. Сакратарыят ЦК КП(б)Б разгледзеў пытанне «Аб рэарганізацыі вышэйшых навучальных устаноў», праект пастановы быў перададзены на разгляд камісіі [16, арк. 26]. 16 красавіка Сакратарыят ЦК КП(б)Б пасля абмеркавання зацвердзіў прапановы камісіі і вырашыў правесці ў першых чыслах мая спецыяльнае пасяджэнне, на якое выклікаць дырэктараў ВТНУ і сакратароў партячэек, а таксама навуковых працаўнікоў-камуністаў [16, арк. 34].

«Карлікавыя» ВТНУ сябе не апраўдалі. Таму 1 ліпеня 1933 г. СНК БССР прыняў пастанову аб рэарганізацыі шасці інстытутаў у адзіны Політэхнічны інстытут, падпарадкаваў яго Упаўнаважанаму Наркамата цяжкай прамысловасці СССР пры СНК БССР. Такім чынам, была адноўлена дзейнасць Беларускага політэхнічнага інстытута (БПІ) – папярэдніка сучаснага БНТУ. Дырэктарам БПІ быў прызначаны Лысоў С. Ю., а ў маі 1934 г. – Дружалоўскі І. І., былы дырэктар БХТІ [17, с. 19, 241]. У выніку з другой паловы 1933 г. падрыхтоўка хімікаў-тэхнолагаў вялася ў структуры БПІ.

У 1934 г. адбыўся першы выпуск студэнтаў БПІ, якія навучаліся ў 1930–1933 гг. у БХТІ. З гэтай нагоды дэлегацыю БПІ 29 жніўня прыняў першы сакратар ЦК КП(б)Б Мікалай Фёдаравіч Гікала. У гутарцы ўдзельнічалі партыйныя работнікі, дырэктар БПІ Дружалоўскі І. І., выкладчыкі, група студэнтаў – выпускнікоў БПІ. Прафесар Прыляжаеў М. А. расказаў аб развіцці Політэхнічнага інстытута. Ад імя выпускнікоў выступіў былы студэнт і сакратар парткалектыву БХТІ, дэлегат XIV з'езда КП(б)Б (студзень 1932 г.), тэхнолаг па малочнай кіслаце Ліпа Якаўлевіч Аксенцоў [18; 19, арк. 7]. Пасля заканчэння БПІ ён быў прызначаны дырэктарам НДІ харчовай прамысловасці, адначасова некаторы час выконваў абавязкі загадчыка вучэбнай часткі БПІ. 2 студзеня 1935 г. Бюро ЦК КП(б)Б быў зацверджаны на пасадзе дырэктара НДІ прамысловасці [20, арк. 70]. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ён затым працаваў старшым выкладчыкам хіміка-тэхналагічнага факультэта (ХТФ) БПІ.

У ліку студэнтаў БХТІ, якія скончылі ў 1934 г. хіміка-тэхналагічны факультэт БПІ, быў таксама Варончанка Аляксандр Аўксенцевіч (1905–1937), партыйны і дзяржаўны дзеяч БССР, які працаваў з 1933 г. у апараце ЦК КП(б)Б і загадчыкам аддзела культуры і прапаганды Мінскага гаркама партыі. 13 мая 1937 г. ён быў прызначаны народным камісарам асветы БССР. З'яўляўся членам ЦК КП(б)Б і яго Бюро, ЦВК БССР. Аднак у жніўні 1937 г. неабгрунтавана арыштаваны, асуджаны і прыгавораны да расстрэлу, у маі 1957 г. рэабілітаваны пасмяротна [21, с. 244–245].

Студэнтам БХТІ па папяровай спецыяльнасці і выпускніком БПІ 1934 г. быў Ахрэм Афанасій Андрэевіч (1913–2010). Ён працаваў на кафедры арганічнай хіміі БПІ. У 1936–1937 гг. – начальнік навукова-даследчага сектара і аддзела аспірантуры БПІ, у 1937–1938 гг. – дэкан хіміка-тэхналагічнага факультэта БПІ. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ён пасля стаў кандыдатам (1949) і доктарам хімічных навук (1960), прафесарам (1970), акадэмікам АН БССР (1970). З 1974 г. працаваў дырэктарам Інстытута біяарганічнай хіміі АН БССР. Аўтар больш за 800 навуковых прац, у тым ліку 13 манаграфій і 100 вынаходніцтваў. Дзейнасць А. А. Ахрэма адзначана ордэнамі Леніна, «Знак Пашаны», Айчыннай вайны І і ІІ ступені, Чырвонай Зоркі, ордэнам Пашаны Рэспублікі Беларусь, медалямі [22, с. 58].

Сакратар Мсціслаўскага райкама КП(б)Б, з лютага 1928 г. загадчык аддзела Аршанскага акружкама КП(б)Б Кавалёў З. Ц. быў залічаны студэнтам-парттысячнікам у БХТІ, дзе навучаўся да сакавіка 1933 г., калі яго адклікалі з вучобы і паслалі на працу сакратаром Любанскага райкама партыі. У сакавіку 1934 г. ён быў пераведзены на працу намеснікам загадчыка прамыслова-транспартнага аддзела ЦК КП(б)Б. У маі па яго просьбе Кавалёву быў дадзены трохмесячны адпачынак для заканчэння БПІ, пасля гэтага ён быў прызначаны на працу начальнікам аддзела падрыхтоўкі кадраў Наркамата мясцовай прамысловасці БССР [23, арк. 68–69].

Студэнтам БХТІ і выпускніком БПІ 1935 г. быў Чорны Ісаак Львовіч, які пасля заканчэння ВТНУ працаваў інструктарам і з 1937 г. загадчыкам прамыслова-транспартнага аддзела ЦК КП(б)Б, а з красавіка 1938 г. Старшынёй Дзяржплана, намеснікам Старшыні СНК БССР. У гады Вялікай Айчыннай вайны на фронце, член Ваеннага савета 22-й арміі, палкоўнік. З 1946 па 1953 г. зноў Старшыня Дзяржплана, намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР [17, с. 220; 24, арк. 15].

Выпускніца ХТФ БПІ 1935 г. Мацюшка Варвара Феафілаўна паступіла ў БХТІ ў 1930 г. па камсамольскай пуцёўцы, пасля заканчэння ВТНУ працавала інжынерам НДІ харчовай прамысловасці. У 1937 г. выбрана трэцім сакратаром ЦК ЛКСМБ, адказвала за працу сярод жанчын, студэнтаў, піянераў і школьнікаў. У ліпені 1938 г. выбрана дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. У 1938–1940 гг. – кандыдат у члены ЦК КП(б)Б. У 1939–1941 гг. працавала намеснікам дырэктара, выконвала абавязкі дырэктара НДІ харчовай прамысловасці БССР. У гады Вялікай Айчыннай вайны – удзельніца Мінскага камуністычнага падполля і партызанка атрада «Мсцівец» брыгады «Народныя мсціўцы» імя В. Т. Воранянскага. Пасля вайны – кіраўнік Белкандытартрэста, намеснік старшыні, старшыня Белсавета прамысловай кааперацыі, намеснік міністра бытавога абслугоўвання насельніцтва БССР. У 1960–1961 гг. – член ЦК КПБ, у 1961–1966 гг. – член Рэвізійнай камісіі КПБ. У 1959–1963 гг. – дэпутат Вярхоўнага Савета БССР і намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР. Узнагароджана ордэнамі Леніна, Айчыннай вайны ІІ ступені, «Знак Пашаны», 10 медалямі [21, с. 198; 25].

Былы студэнт БХТІ Мазелеў Леў Якаўлевіч таксама скончыў БПІ у 1935 г., застаўся на працы ў ВНУ. З'яўляўся сакратаром партыйнага камітэта БПІ, дэканам факультэта, у 1940 г. абараніў

кандыдацкую дысертацыю. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, падпалкоўнік. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I ступені, медалямі. Пасля дэмабілізацыі з арміі працаваў у БПІ дэканам хіміка-тэхналагічнага факультэта, дацэнтам, а ў 1960–1963 гг. загадчыкам кафедры «Тэхналогія шкла». У 1960 г. абараніў доктарскую дысертацыю на тэму «Борнае шкло», з 1961 г. – прафесар. Памёр у 1969 г. [17, с. 168; 26].

**Заключэнне.** Такім чынам, адкрыты у Мінску ў 1930 г. Беларускі хіміка-тэхналагічны інстытут, нягледзячы на цяжкасці станаўлення, непрацяглы перыяд самастойнага існавання, адыграў значную ролю ў падрыхтоўцы кадраў для папяровай, шкляной, керамічнай і харчовай прамысловасці краіны. Летам 1933 г. ён увайшоў у якасці факультэта ў склад БПІ, і студэнты, якія раней навучаліся ў БХТІ, атрымалі ў 1934–1936 гг. дыпломы аб вышэйшай адукацыі і накіраванні на працу на прадпрыемствы краіны. Нямала былых студэнтаў БХТІ, выпускнікоў БПІ, сталі вядомымі навукоўцамі і кіраўнікамі. Хіміка-тэхналагічны факультэт працаваў у БПІ да сярэдзіны 1970-х гг., калі спецыяльнасці харчовага профілю былі пераведзены ў Магілёўскі тэхналагічны інстытут (зараз Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт харчовых і хімічных тэхналогій), а сілікатныя спецыяльнасці ў Беларускі тэхналагічны інстытут імя С. М. Кірава (зараз БДТУ).

### Спіс літаратуры

1. Белорусский государственный технологический университет (1930–2020). К 90-летию университета / авт.-сост.: И. В. Войтов [и др.]. Минск: БГТУ, 2020. 372 с.
2. Промышленность Белоруссии: итоги и перспективы. Минск: ВСНХ БССР, 1928. 126 с.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 42. Воп. 1. Спр. 2056.
4. НАРБ. Ф. 7. Воп. 1. Спр. 689.
5. Савецкая Беларусь. 1930. 20 ліпеня.
6. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 4771.
7. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 5799.
8. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 5526.
9. Интеллектуальная элита Беларуси. Основоположники белорусской науки и высшего образования (1919–1941) / С. В. Абламейко [и др.]; науч. ред. О. А. Яновский. Минск: БГУ, 2017. 303 с.
10. НАРБ. Ф. 108. Воп. 1. Спр. 179.
11. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 6130.
12. Интеллектуальная элита Беларуси. Основоположники белорусской науки и высшего образования (1919–1961) / А. Д. Король [и др.]; науч. ред. О. А. Яновский. Минск: БГУ, 2019. 334 с.
13. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 5614.
14. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 5703.
15. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 5031.
16. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 6470.
17. БНТУ. 100 лет истории / К. И. Баландин [и др.]. Минск: БНТУ, 2020. 244 с.
18. Звязда. 1934. 30 жніўня. С. 1.
19. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 5602.
20. НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 9120.
21. Корнилович Э. Беларусь: созвездие политических имен: историко-биографический справочник. Минск: ФУАинформ, 2009. 408 с.
22. Дубовик А. К. Из истории химико-технологического образования в Белорусском политехническом институте (1920–1975 гг.) // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2022. № 2 (263). С. 56–60.
23. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 7467.
24. НАРБ. Ф. 108. Воп. 1. Спр. 14.
25. Варвара Феафілаўна Мацюшка // Вікіпедыя. URL: https://be.wikipedia.org/wiki (дата звароту: 01.08.2025).
26. Советский инженер. 1969. 10 октября. С. 4.

### References

1. Voitau I. V. (comp.). *Belorusskiy gosudarstvennyy tekhnologicheskiy universitet (1930–2020)* [Belarusian State Technological University (1930–2020)]. Minsk, BGTU Publ., 2020. 372 p. (In Russian).
2. *Promyshlennost' Belorussii: itogi i perspektivy* [Belarusian industry: results and prospects]. Minsk, VSNKh BSSR Publ., 1928. 126 p. (In Russian).
3. National archives of Republic of Belarus (NARB). Fund 42. I. 1. F. 2056.
4. NARB. Fund 7. I. 1. F. 689.
5. *Savetskaya Belarus'* [Soviet Belarus], 1930, July 20 (In Belarusian).

6. NARB. Fund 4п. I. 1. F. 4771.
7. NARB. Fund 4п. I. 1. F. 5799.
8. NARB. Fund 4п. I. 1. F. 5526.
9. *Intellektual'naya elita Belarusi. Osnovopolozhniki belorusskoy nauki i vysshego obrazovaniya (1919–1941)* [Intellectual elite of Belarus. Founders of Belarusian science and higher education (1919–1941)]. S. V. Ablameyko [et al.]; scientific editor O. A. Yanovsky. Minsk, BGU Publ., 2017. 303 p. (In Russian).
10. NARB. Fund 108. I.1. F. 179.
11. NARB. Fund 4п. I.1. F. 6130.
12. *Intellektual'naya elita Belarusi. Osnovopolozhniki belorusskoy nauki i vysshego obrazovaniya (1919–1961)* [Intellectual elite of Belarus. Founders of Belarusian science and higher education (1919–1961)]. A. D. Korol'[et al.]; scientific editor O. A. Yanovsky. Minsk, BGU Publ., 2019. 334 p. (In Russian).
13. NARB. Fund 4п. I. 20. F. 5614.
14. NARB. Fund 4п. I. 1. F. 5703.
15. NARB. Fund 4п. I. 1. F. 5031.
16. NARB. Fund 4п. I. 1. F. 6470.
17. Balandin K. I., Bobkov V. A., Dubovik A. K., Kononov A. N., Kostevich I. L., Sardarov A. S., Khromchenko D. N. *BNTU. 100 let istorii* [BNTU. 100 years of history]. Minsk, BNTU Publ., 2020. 244 p. (In Russian).
18. *Zvyazda* [Zviazda], 1934, August 30, p. 1 (In Belarusian).
19. NARB. Fund 4п. I. 1. F. 5602.
20. NARB. Fund 4п. I. 1. F. 9120.
21. Kornilovich E. *Belarus': sozvezdiye politicheskikh imen: istoriko-biograficheskiy spravochnik* [Belarus: constellation of political names: historical and biographical reference book]. Minsk, FUAinform, 2009. 408 p. (In Russian).
22. Dubovik A. K. From the history of chemical and technological education in the Belarusian Polytechnical Institute (1920–1975)]. *Trudy BGTU* [Proceedings of BSTU], issue 6, History, Philosophy, 2022, no. 2 (263), pp. 56–60 (In Russian).
23. NARB. Fund 4п. I. 1. F. 7467.
24. NARB. Fund 108. I. 1. F. 14.
25. Varvara Felafilauna Matsyushka // Wikipedia. Available at: // https://be.wikipedia.org/wiki (accessed 01.08.2025) (In Belarusian).
26. *Sovetskiy inzhener* [Soviet engineer], 1969, October 10, p. 4 (In Russian).

## Інфармацыя пра аўтара

**Дубовік Аляксандр Канстанцінавіч** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры сацыяльнага кіравання. Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт (пр-т Незалежнасці, 65, 220013, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь). E-mail: kafpolitics@bntu.by

## Information about the author

**Dubovik Aliaksandr Kanstantinavich** – PhD (History), Associate Professor, Assistant Professor, the Department of Social Management. Belarusian National Technical University (65 Nezalezhnasti Ave, 220013, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: kafpolitics@bntu.by

*Пастуніў 03.09.2025*